**УДК 394.6 (476)**

# КІРМАШ У СТРУКТУРЫ ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX–ПАЧАТКУ XX ст.)

***К. А. АНТОНАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*На тэрыторыі Беларусі гандаль выконваў ролю своеасаблівага інтэгратара эканамічных намаганняў мясцовага насельніцтва. У 60-90-я гг. XIX ст. змяняецца структура і формы арганізацыі ўнутранага гандлю. Кірмашы ў гэтай гандлёвай сістэме з'яўляліся камунікацыйным цэнтрам, якія функцыянавалі па адмысловых правілах. У дадзеным артыкуле кірмаш разглядаецца ў структуры эканамічных адносін і беларусаў Падзвіння.*

**Развіццё гандлю на паўночнабеларускіх землях.** У 60-90-я гг. XIX ст. змяняецца структура і формы арганізацыі ўнутранага гандлю, павялічыліся яе аб'ёмы. Гэта было абумоўлена і ростам колькасці гарадскога насельніцтва, і фарміраваннем рэгіянальных рынкаў. З 1863 па 1896 г. насельніцтва гарадоў павялічылася з 330 тыс. да 648 тыс. чалавек, склаўшы 10% агульнай колькасці. У пачатку XX ст. унутрыбеларускі рынак працягваў пашырацца, адначасова мацнелі яго сувязі з агульнарасійскім і заходнееўрапейскім рынкамі. Беларусь актыўна гандлявала сельскагаспадарчай прадукцыяй і лесаматэрыяламі. Устойлівым попытам карысталіся лён, прадукцыя жывёлагадоўлі, сырой лес, папера, запалкі, вырабіў скуры, спірт [7, с. 8].

У канцы XVIII - першай палове XIX ст. беларускія губерні, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі, мелі больш развітую сістэму шляхоў зносін. Пашырэнне дарожнаяга будаўніцтва, рэканструкцыя і рамонт старых дарог, развіццё транспарту, а таксама будаўніцтва новых каналаў, якія злучылі басейны розных рэк – усё гэта забяспечвала хуткі і пастаянны тавараабмен як паміж асобнымі рэгіёнамі і губернямі, так і з іншымі рэгіёнамі і замежжам [3, С.52].

**Кірмаш у структуры гандлёвай дзейнасці**. Кірмаш – гэта форма арганізацыі гандлю, пры якой торг адбываецца ў час перыядычнага з'езду гандляроў у пэўным месцы і на працягу вызначанага тэрміну адзін або некалькі разоў у год. Дазвол на адкрыццё кірмашоў давала Магдэбургскае права, прывілеі вялікіх князёў Вялікага Княства Літоўскага і каралёў польскіх, пастановы і ўказы царскага ўрада [14, с.181].

Як правіла, сельскія кірмашы, у першую чаргу, з'яўляліся часткай храмавых святаў, на якіх сяляне збіраліся з мэтай памаліцца і замаліць свае грахі. Амаль усе буйныя кірмашы XIX ст., якія адбываліся ў розных мясцовасцях Беларусі, былі прымеркаваныя да царкоўных святаў і насілі іх найменні: Петрапаўлаўскі (Бешанковічы Лепельскага пав.), Юраўскі (Віцебск), Успенскі [7, с.378].

Звычайна кірмашы праходзілі ў павятовых гарадах, у мястэчках, у казённых паселішчах, у вёсках і ў пагостах. Некаторыя мястэчкі адрозніваліся развіццём гандлю, у іх збіраліся буйныя кірмашы. Аднак большасць мястэчак адносілася да невялікіх паселішчаў, асноўную частку насельніцтва якіх складалі сяляне. Развіццё гандлю ў мястэчках, існаванне прамысловых прадпрыемстваў абумовілі перавод шэрага мястэчак у разрад пазаштатных гарадоў [8, с. 7].

На Падзвінні пачынаюць спыняцца ярмаркі, на якія з'язджаліся купцы не толькі з аддаленых губерняў, але і з-за мяжы. На іх месца прыходзяць невялікія кірмашы – гадавыя таргі, якія збіраліся ў цэрквах і касцёлах. Лічыцца, што ў аснове дадзеных кірмашоў ляжыць звычай даваць праваслаўныя царквы ў арэнду габрэям, якім па асаблівым каралеўскім граматам і прывілею давалася афіцыйны дазвол у дні храмавых святаў варыць мёд і піва, з далейшай іх продажам. Пасля літургіі арганізоўваліся масавыя гулянні, на якіх спачатку прадаваліся толькі напоі і прысмакі, а праз час на падобных кірмашах можна было сустрэць як харчовыя запасы, так і рознага роду сялянскія вырабы альбо ж мануфактурныя і фабрычныя тавары. Такім чынам асноўнае насельніцтва пачынае сцякацца на падобныя падзеі не толькі для службы ў храме і для споведзяў, але для гандлю і задавальнення, таму як гандаль суправаджалаўся рознымі гульнямі і забавамі [13, с. 258].

Да такіх кірмашах вельмі негатыўна ставілася духавенства, асабліва тых храмаў, на тэрыторыі якіх праходзілі кірмашы. У прыклад можна прывесці іераманаха Сергія віцебскага Маркава манастыра, па думку якога існуючы звычай кірмашства не можа не быць абуральным для рэлігійна-маральных пачуццяў веруючых і святасці святочных дзён саміх месцаў, паблізу якіх з'яўляюцца гэтыя падзеі [13, с. 259].

Звычайна кірмаш размяшчаўся на спецыяльнай плошчы, тэрыторыю якой часта маглі агароджваць. Тавар размяшчаўся на вазах, а навала вазоў ўжо фармавала гандлёвыя рады. Агульным для ўсіх кірмашоў з'яўляецца дзяленне іх на рады спецыялізаванага гандлю: мясны, хлебны, рыбны,

ганчарны і інш. У большасці крыніц гаворыцца пра тое, што часцей за ўсё ў ролі гандляроў выступалі габрэі, якія гандлявалі вырабамі мясцовай вытворчасці. Габрэйскія купцы г. Люцына (Віцебская губерня) гандлявалі ільном, хлебам, гароднінай. Габрэі таксама гандлявалі сукном, шоўкам з мясцовых фабрык, садавінай, галантарэйнымі, пушнымі і іншымі дробнымі таварамі [4, с. 60].

Сустракаюцца таксама згадкі пра тое, як гандлююць цыганы, у асноўным жывёлай. Акрамя таго, у кірмашовым гандлі ў асноўным удзельнічалі дваране, купецтва, мяшчане, сяляне, а таксама чужаземцы. Трэба адзначыць, што самі гараджане менш адчувалі патрэбу ў пакупках на кірмашах, таму што неабходныя прадукты сельскай гаспадаркі, вырабы сялянскіх промыслаў і мануфактурныя тавары яны маглі набыць на базарах, куды прыбывалі сяляне як гандляры, а атксама ў лаўках [3, с.53].

Функцыянаванне ўнутранага рынку забяспечвалася вялікай колькасцю дробных гандлёвых пасярэднікаў-карабейнікаў, фактараў, прасолаў, маклераў і камісіянераў, якія кантралявалі гэты гандаль [4, с. 60].

Вельмі важным з'яўляецца той факт, што эканамічнае развіццё беларускіх гарадоў у значнай ступені вызначалася узроўнем развіцця сельскай гаспадаркі. У першую чаргу сельская гаспадарка давала сыравіну для шэрагу галін прамысловасці, пастаўляла сельскагаспадарчую прадукцыю не толькі для знешняга, але і для ўнутранага рынку. Развіццё авечкагадоўлі, пашырэнне пасеваў тэхнічных культур, галоўным чынам бульбы, лёну, канопляў, цукровых буракоў, увядзенне чатырохпольнай сістэмы сяўбазвароту, прымяненне ў гаспадарцы малацільных і іншых сельскагаспадарчых машын спрыялі павелічэнню таварнасці сельскай гаспадаркі [9, с.131].

Даволі распаўсюджаным прадметам гандлю на сельскагаспадарчых кірмашах з'яўляецца працоўны сялянскі інвентар, які заўсёды быў актуальным для куплі-продажу. А таму на сельскіх кірмашах заўсёды можна сустрэць у вялікай колькасці скуру, лён, пяньку, воск і некаторыя хатнія вырабы: вазы, колы, кадкі, вёдры, палотны і іншае. Нароўні з сельскагаспадарчым інвентаром, ільном, пянькой і іншымі прадметамі сялянскага ўжытку, галоўныя здзелкі здзяйсняюцца са скатом – рагатым, а таксама коньмі, свіннямі і птушкамі.

Сярод жывёлы першае месца па гандлёвым значэнні займаюць коні. Гэта абумоўлена тым, што на тэрыторыі Беларускага Падзвіння коні з'яўляліся асноўнай цяглавай сілай у сялянства. З вялікіх конскіх кірмашоў Віцебскай губерні варта адзначыць у мястэчках Крэслаўцы, Асвеі і ў слабадзе Асунь. Часцяком коньмі гандлююць менавіта цыганы, так як ведаючы добра цану свайму тавару, яны рэдка збываюць яго за грошы і ахвотна мяняюць сваіх кляч на бараноў, коз, свіней. Па рагатай жывёле і свіннях з вялікім поспехам прайшоў кірмаш у Бешанковічах, тут жа атрымалі добры збыт алейныя насенне. У Ковенскай губерні вялікае значэнне маюць кірмашы ў Вількаміры, у Янішках, Пасвол’е, Шаты і Шкуды. Коні з гэтых кірмашоў часта адпраўляюцца ў Прусію [5, с 39-42].

У рэгіёнах, багатых на рэкі і азёры, важнае значэнне мела рыбная лоўля, якая знайшла сваё адлюстраванне ў фарміраванні рыбных кірмашоў. У Відзах, сучаснага Браслаўскага раёна, на рыбным кірмашы, які штогод адбываўся на Ілью, акрамя самой рыбы прапаноўваліся розныя рыбацкія прылады: двухгорлавыя буды для лоўлі ракаў, мярэжы, сеткавае палатно. Штогоднія таргі арганозоўваліся і на некаторых вадаёмах у час інтэнсіўай рыбнай лоўлі [3, с.55].

Разам са спецыялізаванымі на тэрыторыі Падзвіння, як і па ўсёй тэрыторыі краіны, ладзілі універсальныя кірмашы, на якіх побач з прамысловымі таварамі прадавалі сельскагаспадарчую прадукцыю. У першай палове 60-х гг. XIX ст. у асартыменце на кірмашах былі такія тавары, як збожжа, лён, пянька, сала, скуры, жывёлы. Акрамя таго, дастаўляліся дзёгаць, посуд, прылады працы, палатно, сукно. Прадавалі таксама гатовае адзенне, абутак, свечкі, мыла і іншыя тавары. Прамысловыя тавары пераважалі толькі на буйных кірмашах [6, с. 58].

Выразную ролю меў феномен магарыча, які з’яўляўся адным з прававых звычаяў, заснаваны на частаванні гарэлкаю супрацьлеглага боку з пасрэднікамі для зацвярджэння абмену, куплі-продажу і шматлікіх умоў featurнага характару. Адбываўся ён на кірмашы ці ў доме. Найчасцей справа заканчвалася вялікай п’янкай у карчме, дапоўненай падчас кірмашу, дзе падсядалі знаёмыя і ўсе па чарзе плацілі. Калі абмен ці купля-продаж адбывалася паміж двумя гаспадарамі на месцы, магарыч адбываўся ў доме з удзелам аднаго ці двух запрошаных суседаў. Лічылася, што пасля магарыча дамова не можа быць скасавана, нават калі адзін з бакоў заўважыў памылку [1, с. 54-55].

У другой палове XIX ст. прасочваецца змяншэнне ролі кірмашовага гандлю, якое адбывалася ў выніку будаўніцтва новых чыгунак і пераходу ад нерэгулярнага да пастаяннага крамава-лавачнага гандлю. Аднак, напрыклад, у некатарых гарадах Віцебскай губерніі кірмашы працягвалі садзейнічаць развіццю мясцовага гандлю, паколькі адзначаныя населеныя пункты ў канцы XIX ст. былі аддалены ад чыгуначных і рачных шляхоў зносін [2, с. 186].

**Эканамічная спецыялізацыя кірмашоў паўночнай Беларусі.** Наогул кірмашы былі даволі частай падзеяй на тэрыторыях Віцебскай губерні. Паводле крыніц, першае месца па колькасці кірмашоў належала Люцынскаму павету, у якім колькасць кірмашоў даходзіла да 60.

Па кошту прадаваных тавараў першынство належала Лепельскаму павету, у якім здзяйсняецца знакаміты ў тутэйшым краі Бешанковіцкі кірмаш, за ім ідзе Дынабургскі, які мае два значныя кірмашы, далей Невельскі з двума значнымі кірмашамі, потым Себежскі, Вележскі, Дрысенскі, Люцынскі, Суражскі, Рэжыцкі, Полацкі, Віцебскі і Гарадоцкі з нікчэмнымі тавараабаротамі і тое, вельмі непастаяннымі (гл. дадатак А1). Большая палова кірмашоў маюць самы нікчэмны абарот, які не перавышае нават 100 рублёў [13, с. 260-277].

Згодна з памятнай кніжкай Віленскай губерні, гандаль на гэтай тэрыторыі быў не самай значнай з'явай, а калі і быў, то знаходзіўся пераважна ў руках габрэяў. Гандлявалі яны ў асноўным мануфактурнымі таварамі, фаянсавым посудам і фарфорам, срэбнымі і залатымі вырабамі, сельскагаспадарчай прадукцыяй, соллю, селядцом, тытунём, цукрам віном і іншымі рэчамі мясцовага спажывання. Пачынаючы з канца XVIII стагоддзя і да сярэдзіны XIX стагоддзя колькасць кірмашоў не перавышала 100. Так, у 1785 годзе на тэрыторыі ўсёй губерні прайшло 85 кірмашоў [10], а ў 1878 ўсяго толькі 96 [11]. Але ўжо да 1887 года можна назіраць значны прырост колькасці праведзеных кірмашоў, якіх налічваецца ўжо 154 [12], а да 1888 года – 164 [13]. На 1900 год іх колькасць дасягае 394. Трэба адзначыць, што сярод іх вялікая колькасць праходзіла ў Вілейцы, Дзісне і Друе [14]. У Друі звычайна праходзіць два кірмашы: Богаяўленская і зборная, другая з якіх з'яўляецца найменш значнай, чым першая. Такое рэзкае павелічэнне колькасці кірмашоў можа быць следствам рэформаў 60-70-х гг. XIX стагоддзя, якія дапамаглі стварыць даволі спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы і прамысловасці.

Варта адзначыць, што Памятныя кніжкі губерняў, а таксама Агляды губерняў будуць з'яўляцца найважнейшым крыніцай, які дае статыстычную інфармацыю аб правядзенні кірмашоў. Такім чынам, на тэрыторыі Віцебскай губерні кірмашы праводзіліся не толькі ў кожным павятовым горадзе, але і ў мястэчках, у слабадах, у вёсках, вёсках і пагостах. Самымі буйнымі па колькасці праведзеных кірмашоў займаюць Люцінскі, Дынабургскі і Невельскі паветы, але па кошту прададзеных тавараў вылучаецца Лепельскі павет, у якім прайшоў знакаміты Бешанковіцкі кірмаш. На тэрыторыі Віленскай губерні ўнутраны гандаль не быў настолькі развіты, як у Віцебскай, але на працягу ўсяго XIX стагоддзя назіраецца даволі магутнае павелічэнне колькасці кірмашоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Абмен і гандаль у беларускім традыцыйным грамадстве як прадмет этналагічнага даследавання / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета: научно-теоретический журнал. – 2018. – № 1. – С. 54-58
2. Бурачонак, А. В. Вывучэнне гандлёвых адносін на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.: (на матэрыялах «Аглядаў губерняў») / А. В. Бурачонак // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – 2015. – Вып. 10. – С. 180-188
3. Гуд П.А., Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд – Мінск: Полымя, 1996. – 269 с.
4. Евреи в торговле Беларуси в конце XVIII – начале XX века / Эмануил Иоффе // Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання : матэрыялы I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14-16 лістапада 2013 г.) / [адказны рэдактар З. Шыбека]. – Мінск, 2014. – С. 57-67
5. Канделаки, И. Роль ярмарок в русской торговле/ И. Канделаки. – Спб: Тип. Ред. период. изд. м-ва фин-в, 1914. – 60 с.
6. Катлярчук А. Кірмашовае свята // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. – Мінск, 1997. - С. 181.
7. Лобач, У. А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве: [манаграфія] / У. А. Лобач. - Мінск: Тэхналогія, 2013. - 510 с.
8. Лютая А.Э., Сацыяльна-эканамічнае развіцц гарадоў і мястэчак Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. / А. Э. Лютая// Бел. дзярж. ун-т ім. Максіма Танка – 2012. – № 2 (72). – С. 3-8.
9. Лютый А.М., Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце в конце XVIII-первой трети XIX в. / А.М.Лютый – Минск: Наука и техника, 1987. – 181 с.
10. Обзор Виленской губернии за 1887 год. – Вильна: Губ. тип. [1888]. – [4], 39 с.
11. Обзор Виленской губернии за 1888 год. – Вильна: Губ. тип. [1889]. – [4], 46, [53] с.
12. Обзор Виленской губернии за 1900 год. – Вильна: Губ. тип. [1901]. – [4], 101, [85] с.
13. Памятная книжка Витебской губернии – 1887 г. – Витебск.: Тип. Губерноского правления, 1887 г. – 312 с.
14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 4. Кадэты – Ляшчэня / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1997. – 432 с.